■ Незвычайнае хобі

# Неймаверныя гісторыі сапраўдных грошай

Пякельная валюта для памерлых, «фані мані» для ваенных і «фуд-стэмп» для малазабяспечаных

**Долары з экзатычнымі птушкамі, раслінамі і жывёламі, выявамі міфічных істот, партрэтамі вядомых людзей... Разглядаючы неймаверны збор купюр віцебскага калекцыянера Леаніда ЯЛАВА, можна не толькі ўразіцца іх незвычайным выглядам, але і даведацца пра асаблівасці жыцця і гісторыі некаторых краін.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## 50 ТРЫЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ ЗА ТУАЛЕТНУЮ ПАПЕРУ

Банкнотамі з калекцыі карыстаюцца ці калісьці ўжывалі ў 26 краінах свету. Амаль усе купюры сапраўдныя — за выключэннем «грошай» гумарыстычных і сувенірных серый ды амерыканскіх купюр наміналам ад 10 доларaў.

Апантаны збіральнік папаўняе сваю скарбонку на працягу больш як 20 гадоў. А пачалося ўсё з паперкі ў $1, што ўпотай прывёз Леаніду яго сябра яшчэ ў 1979-м. Самыя «старажытныя» купюры ў яго калекцыі — 1- і 2-доларавыя банкноты 1899 года выпуску.

У некаторых краінах знешні выгляд грошай мяняўся адпаведна гістарычным падзеям у іх. Напрыклад, у Малаі ў 1942—1945 гг. разлічваліся ваеннымі доларамі, выпушчанымі Японіяй спецыяльна для акупаваных тэрыторый, калі даваенных грошай перастала хапаць. З-за выявы бананаў на банкнотах у $10 іх неафіцыйна называлі «бананавымі». Пасля набыцця незалежнасці тут з'явілася свая валюта — долары Малаі і брытанскай Барнеа.

Некаторыя долары зніклі з іншых прычын. Напрыклад, у Зімбабве гэта адбылося праз гіперінфляцыю, якая ў 2006—2009 гг. дасягнула памераў 231 млн працэнтаў за год. Зямельная рэформа, праведзеная ўрадам краіны і прэзідэнтам Робертам Мугабэ, дазволіла карэннаму насельніцтву захопліваць маёнткі белых пасяленцаў і практычна зруйнавала сельскагаспадарчы сектар. У краіне з'явіліся купюры ў 50 мільёнаў, 5, 25 і 50 мільярдаў, 50 і 100 трыльёнаў. За гэты час адбылося тры дэнамінацыі, і на пачатку 2009-га $1 ЗША тут каштаваў ужо 300 трыльёнаў зімбабвійскіх «зялёных», а ў лютым — 1 «суперновы долар 2009 г.» раўняўся 10 секстыльёнам (10 000 000 000 000 000 000 000) старых долараў узору пачатку 2006-га.

— Хлеб пры гэтым каштаваў 10 млн, сандвіч з сасіскай — 30 млн, а рулон туалетнай паперы — увогуле 50 трыльёнаў. Калі б размяняць гэтую банкноту на паперчыны маленькіх наміналаў (па $50 млн!), то карыстацца грашыма замест туалетнай паперы было выгадней, чым купіць рулон.

**«Вясной стануць вядомыя вынікі чарговага «грашовага конкурсу» «Банкнота года — 2016». У ім будзе ўдзельнічаць і наша 100-рублёвая купюра, якую намінаваў нямецкі калекцыянер».**









## ВАЕННЫЯ, АНТАРКТЫЧНЫЯ І НА ЕЖУ

Экзатычная валюта — долары Антарктычнага заморскага банка, які ў 1996 годзе арганізавала група амерыканцаў-энтузіястаў. Яны меркавалі, што антарктычныя грошы стануць паўнавартаснымі і будуць абменьвацца на звычайныя долары 1:1. Валюта мела некалькі ступеняў абароны і серыйныя нумары. На грашах змяшчаліся выявы чаек, альбатросаў, коцікаў, пінгвінаў Адэлі, што сустракаюцца толькі ў Антарктыдзе, і іншых жывёл.

Пасля Другой сусветнай вайны з 1946 па 1968 г. амерыканскае казначэйства друкавала ваенныя сертыфікаты для армейцаў, якія знаходзіліся за межамі краіны. Гэтыя, як іх называлі, смешныя грошы — funny money («фані мані») — выкарыстоўваліся толькі ў ваенных крамах і былі абсалютна бескарыснымі для грамадзянскіх асоб.

У ЗША дзейнічае таксама некалькі сацыяльных праграм дабрачыннасці, у межах якіх выпускаюцца грошы-талоны для малазабяспечаных — food-stamp («фуд-стэмп»). На талон наміналам $1 можна набыць ежу. Цяпер Дэпартамент сельскай гаспадаркі ЗША пераводзіць такую дапамогу на банкаўскія карткі.

## СУЧАСНАЯ ГІСТОРЫЯ І ЗАМАГІЛЬНЫ РЫТУАЛ У БАНКНОТАХ

Долары некаторых дзяржаў карысныя тым, што па іх «вокладцы» можна шмат даведацца пра краіну, дзе яны выпушчаны. Напрыклад, ямайскія банкноты знаёмяць з прыродным багаццем вострава і эканамічнымі прыярытэтамі. Баксідавыя руднікі намаляваны на купюры ў $10, а мясцовыя пляжы і гатэлі — на $50 і $100.

Долар Кайманавых астравоў — грошы замежнай тэрыторыі Вялікабрытаніі ў Вест-Індыі — уведзены ў абарот у 1972 г. На банкнотах рознага наміналу, якія ўпрыгожвае партрэт англійскай манархіні, можна прасачыць, як Елізавета выглядала ў розныя гады.

Ганконгскія долары — плацежны сродак спецыяльнага адміністрацыйнага раёна Кітайскай Народнай Рэспублікі. Яны выпускаюцца трыма камерцыйнымі банкамі. Першы з іх друкуе на купюрах аднаго з двух сваіх ільвоў-талісманаў. Другі — міфічных жывёлін. Трэці — будынак уласнай ганконгскай штаб-кватэры — футурыстычны хмарачос.

— Грошы гэтых банкаў у новым дызайне ходзяць нароўні са старымі, таму сустракаецца да 6 тыпаў усіх наміналаў купюр у 10, 20, 50, 100, 500 і 1000 ганконгскіх доларaў.

У сучасным Кітаі існуюць спецыяльныя грошы для нябожчыкаў: «грошы апраметнай», або «грошы замагільнага банка». Карыстаюцца імі толькі на тым свеце, на гэтым жа атрымаць падобную банкноту — страшэнная абраза. Рытуальныя банкноты маюць вялікія наміналы: тысячы, мільёны і мільярды доларaў. Лічыцца, што на іх душы памерлых жывуць на тым свеце. Пякельныя долары паляць у печах пры храмах, пускаюць па ветры падчас пахавальнай цырымоніі ці пакідаюць на магіле. Апошнім часам становіцца папулярным рабіць і спецыяльныя банкаўскія пластыкавыя карткі для памерлых, каб паліць іх, як і грошы.

## ЯСКРАВАЯ ДЗЯСЯТКА

Дэвід Стэндыш, дызайнер і аўтар кнігі «Мастацтва грошай», склаў топ-дзясятку самых прыгожых грошай свету. З гэтага спісу ў калекцыянера трохдоларавая купюра вострава Кука з аголенай Інай (у палінезійскай міфалогіі — багіня святла, жонка бога Месяца) верхам на акуле і 10 ганконгскіх доларaў — шматколерная банкнота, выява на якой сімвалізуе ажыўленне вялікага горада, дзе жыццё кіпіць дзень і ноч.

— Штогод міжнародная супольнасць калекцыянераў вызначае дзясятку самых яскравых папяровых купюр свету, выпушчаных за апошні год. Свае спісы складаюць на суд журы вядомыя калекцыянеры з розных краін. Вясной стануць вядомыя вынікі чарговага «грашовага конкурсу» «Банкнота года — 2016». У ім будзе ўдзельнічаць і наша 100-рублёвая купюра, якую намінаваў нямецкі калекцыянер. Дарэчы, яна адзіная з выяваў будынка — на астатніх партрэты, таму, магчыма, мае шанцы трапіць у топ праз такую адметнасць, — падзяліўся калекцыянер.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

***Больш здымкаў глядзіце на www.zviazda.by.***

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
| --- | --- | --- | --- |
| Мінск — | 8.11 | 18.35 | 10.24 |
| Віцебск — | 8.04 | 18.22 | 10.18 |
| Магілёў — | 8.02 | 18.25 | 10.23 |
| Гомель — | 7.56 | 18.24 | 10.28 |
| Гродна — | 8.26 | 18.51 | 10.25 |
| Брэст — | 8.24 | 18.54 | 10.30 |

## Месяц

*Апошняя квадра 18 лютага.*
*Месяц у сузор'і Вадалея.*

## Імяніны

*Пр. Валянціны, Ганны, Паўлы, Парфірыя, Прохара.*
*К. Ізабелы, Дзям'яна, Палікарпа, Рамана, Севярына.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**23 лютага чарговы раз зразумеў, што ўдала ажаніўся. Замест чаканых шкарпэтак, трусоў і дэзадаранта любая жонка падарыла мне скрыню любімага піва.**

— Дарагі, а давай згуляем вяселле 23 лютага?

— Ты хочаш сапсаваць мне свята?!

**Народная прыкмета: якім быў у мужа настрой 23 лютага, такім ён будзе ў жонкі 8 Сакавіка.**

Дзяўчына хлопцу напярэдадні 23 лютага:

— Sms-ка каштуе грошай, а ўсё, што каштуе грошай, лічыцца падарункам.

**Толькі напярэдадні 23 лютага можна ўбачыць у аўтобусе дзяўчыну з усмешкай з толькі што набытым дрылём.**

О, гэтая жаночая помста!

14 лютага:

— А ты хіба каталічка?

23 лютага:

— А ты хіба ваенны?

**Назіранне: 23 лютага — паўсюдна п'яныя мужыкі, 8 Сакавіка — паўсюдна п'яныя мужыкі.**

Аб'ява ў інстытуце:

«Вучыцеся! Інакш свята 23 лютага можа стаць для вас прафесійным!»



Малюнак Леаніда ГАДУНА і Міхася СТЭФАНЕНКІ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 702.
Нумар падпісаны ў 19.30 22 лютага 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12